асяроддзі, ён існуе. Вакзал становіцца цэнтрам яго паўсядзённасці, дзе ён вымушаны прыстасоўвацца да незвычайных умоў. Тут ён вучыць урокі, чакаючы цягнік, або знаходзіць ціхую прастору ў самім вагоне, каб паглыбіцца ў кнігі і прачытаць іх, нягледзячы на мутнае святло ліхтара.

У апавяданні Яўгена Васілёнка «Помнік» вакзал становіцца пунктам, дзе Павел Лыкоўскі, былы салдат, пачынае сваё падарожжа ў мінулае, у роднае сяло Сысоеўку, з якім звязаны яго ўспаміны пра вайну і сябра. Вакзал тут сімвалізуе пераход ад сучаснасці да мінулага, ад гарадскога жыцця да вясковай цішыні. Павел Лыкоўскі вяртаецца ў вёску Сысоеўка пасля вайны, каб ажыццявіць сваю мару — паставіць помнік свайму сябру, Сашу Пасмітнаму, які быў закатаваны фашыстамі ў гэтай вёсцы.

Чыгуначная станцыя ў параўнанні з вакзалам увасабляе больш лакалізаваныя мастацкую прастору і рух. Як і ў апавяданні «Помнік», у творы «Як назвалі станцыю» Яўген Васілёнак звяртаецца да ўспамінаў герояў пра вайну. Станцыя «Надзея» сімвалізуе памяць пра яе і сувязь паміж чалавечымі лёсамі. Яна паўстае не проста як геаграфічны пункт, дзе калісьці напружана працавала «разведвальная партыя», якая даследавала трасу для чыгункі. Станцыя стала месцам сустрэчы і яднання людзей, якія прыехалі з розных куткоў краіны, бо дала ім магчымасць пазнаёміцца і падзяліцца сваімі гісторыямі: «Мы разгаварыліся. Сусед быў не такі ўжо негаваркі чалавек, як здалося мне спачатку» [3, с. 338].

**Заключэнне.** Вобраз чыгункі ў беларускай літаратуры — гэта шматзначны сімвал, які адлюстроўвае гістарычныя, сацыяльныя і культурныя змены ў жыцці народа і асобных людзей. Вобразы цягніка, вагона, трамвая, вакзала і станцыі дапамагаюць раскрыць матывы грамадскага прагрэсу, сацыяльных канфліктаў, чалавечых лёсаў. Даследаванне гэтых вобразаў дазваляе глыбей зразумець беларускую літаратуру ў гістарычным і культурным кантэксце часу.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Чорны, К.* Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; рэдкал. : В. В. Барысенка, А. Адамовіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1972—1975. — Т. 1 : Апавяданні 1923—1927 / рэд. тома А. Ф. Харкевіч, В. В. Барысенка, А. Д. Атаева. — 1972. — 542 с.
2. *Лынькоў, М.* Міколка-паравоз : аповесць / М. Лынькоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. — 123 с.
3. *Васілёнак, Я. П.* Выбраныя творы : у 2 т. / Я. П. Васілёнак. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. — Т. 1 : Апавяданні. — 359 с.

УДК 821.161.3

**Г. В. Вярбіцкая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

## ТЫПАЛОГІЯ ГЕРОЯЎ ПРАЗАІЧНЫХ ТВОРАЎ У КАНТЭКСЦЕ «ЧЫГУНАЧНЫХ» МАТЫВАЎ

**Уводзіны.** «Чыгуначныя» матывы займаюць значнае месца ў беларускай літаратуры, адлюстроўваючы як тэхнічны прагрэс, так і яго ўплыў на чалавечыя лёсы. У гэтым кантэксце ўзнікаюць розныя тыпы герояў, кожны з якіх па-свойму ўспрымае і перажывае звязаныя з чыгункай змены. Ад працаўнікоў чыгункі, якія адчуваюць сябе часткай магутнай сістэмы, да выпадковых пасажыраў, чые жыццёвыя шляхі часова пераплятаюцца, — кожны вобраз раскрывае пэўны аспект узаемадзеяння чалавека і тэхнікі, традыцый і новага часу. Разгляд тыпалогіі гэтых герояў дазваляе глыбей зразумець адлюстраванне эпохі ў літаратуры і выявіць асноўныя тэмы, якія хвалююць беларускіх пісьменнікаў. У прааналізаваных творах намі вылучаны наступныя вобразы: машыністы-рамантыкі, адданыя працаўнікі, качагары, злодзеі, бунтары і музыканты.

**Асноўная частка.** *Машыністы-рамантыкі* — гэта асобы, якія знаходзяць паэзію і веліч у тэхнічным прагрэсе. Яны не проста кіруюць цягнікамі, а адчуваюць сябе «пілотамі» сталёвых птушак, якія імчаць у будучыню. Прыкладам служыць вобраз Андрэя Летуна з аднайменнага апавядання Міхася Лынькова. Герой бачыць у цягніку не проста сродак перамяшчэння, а крылы, якія нясуць яго ў будучыню: «І ляцім жа, браткі!.. Э-эх, ляцім!.. Даганяй — не дагоніш…» [1, с. 28]. Андрэй адчувае сябе свабодным і шчаслівым чалавекам менавіта ў руху, за рулём цягніка. Выраз «даганяй — не дагоніш» выяўляе гонар за ўласную працу і майстэрства.

*Адданыя працаўнікі*. Гэты тып герояў увасабляе сумленнасць, працавітасць і вернасць сваёй справе. Адданыя працаўнікі могуць быць нешматслоўнымі і суровымі, але за знешняй стрыманасцю хаваецца пачуццё глыбокай адказнасці. Яскравым прыкладам з'яўляецца машыніст з апавядання Кузьмы Чорнага «Жалезны крык». Гэта «чалавек чорны і маўклівы, пакрыты тонкім пластам мокрай сажы і мутнага поту», яго постаць выяўляе цвёрдую ўпэўненасць у сваёй сіле і вернасць справе [2, с. 92]. Чорны колер у творах Кузьмы Чорнага сімвалізуе не толькі цяжкую працу, але і саму эпоху індустрыялізацыі. Машыністы ў Кузьмы Чорнага, — як правіла, маўклівыя і сур'ёзныя людзі, адданыя сваёй справе. Чорны колер падкрэслівае гэтыя рысы характару.

Побач з машыністамі часта працуюць іх памочнікі — *качагары*. Яны звычайна больш жывыя і вясёлыя персанажы, таксама адданыя сваёй працы. Кузьма Чорны ў апавяданні «Жалезны крык» апісвае качагара як «высокага, тонкага і вёрткага чалавека», які весела і з усмешкай кідае вугаль у «рот машыны», ствараючы кантраст з задуменным машыністам [2, с. 92].

Рэпозиторий БарГУ

У творы Хвядоса Шынклера «Апошні рэйс» падкрэсліваецца, што машыніст, памочнік і качагар разам нясуць вялікую адказнасць за бяспеку пасажыраў і захаванасць грузу. Героі адчуваюць веліч сваёй місіі, нягледзячы на знешнюю непрывабнасць і складанасць прафесіі чыгуначніка: «Запалам сваім на працы, захапленнем працоўным працэсам рамонту пуцей, прыкладам сваім уздзейнічаў на іх, выклікаў павагу да чыгункі, да вірлівага суладжанага жыцця яе» [3, с. 234].

У творах пра чыгунку прысутнічаюць і адмоўныя персанажы — такія, як Клемас Вітка з апавядання Лукаша Калюгі «Зоры Вам Вядомага горада». Гэта не проста *злодзей*, а складаная асоба, якая бачыць у крадзяжы своеасаблівы выклік грамадству. Клемаса Вітку прываблівае не столькі вынік, колькі сам працэс падрыхтоўкі злачынства, які ён лічыць «амаль навуковай працай», што патрабуе вывучэння раскладаў і «артыстычнага» ўмення злавацца, застаючыся незаўважным [4, с. 499].

Эпоха тэхнічнага прагрэсу нараджае і *бунтароў*, якія супрацьстаяць панаванню машыны над чалавекам. Такім прыкладам з'яўляецца вобраз селяніна ў апавяданні Кузьмы Чорнага «Жалезны крык». У свеце тэхнікі гэты герой адчувае сябе адчужаным, ён аддае перавагу гармоніі з прыродай. Яго трагічная гібель пад коламі цягніка сімвалізуе канфлікт паміж традыцыйным укладам жыцця і наступаючай цывілізацыяй. Нават пасля смерці постаць героя «захавала адзнакі натугі», што падкрэслівае ў характары ўнутранае напружанне і боль ад сутыкнення з новым светам: «…ў сваёй постаці захаваў ён адзнакі натугі — пальцы былі сціснуты ў кулакі, ніжняя губа была глыбока пракушана зубамі» [2, с. 98].

Нярэдка на чыгунцы сустракаюцца і *музыканты,* якія прыносяць радасць і святло ў аднастайнае жыццё пасажыраў. Такім персанажам з'яўляецца стары Баталевіч у апавяданні Яўгена Васілёнка «Асенні трамвай». Яго з'яўленне ў вагоне ажыўляе ўсіх навокал. Музыка баяна стварае непаўторную атмасферу: «Здавалася, што ў старэнькім, няважненькім на выгляд баяне схаваны цэлы аркестр» [5, с. 63]. Гукі інструмента выклікаюць у слухачоў асацыяцыі з вобразамі прыроды і далёкіх падарожжаў, ператвараючы звычайную паездку ў чароўнае імгненне.

**Заключэнне.** У беларускай літаратуры «чыгуначныя» матывы служаць для адлюстравання сутнасці тэхнічнага прагрэсу і яго ўплыву на чалавечыя лёсы. Вылучаныя тыпы герояў — машыністы-рамантыкі, адданыя працаўнікі, качагары, злодзеі, бунтары і музыканты — раскрываюць розныя аспекты ўзаемадзеяння чалавека і тэхнікі, традыцый і новага часу.

Пісьменнікі паказваюць складаныя адносіны паміж чалавекам і машынай. З аднаго боку, чыгунка стварае новыя магчымасці, пашыраючы гарызонты жыцця і паскараючы яго тэмп. З іншага боку, яна можа стаць прычынай адчужэння людзей, страты імі звыклага ладу існавання, што можа прывесці нават і да трагедыі. Героі твораў адлюстроўваюць увесь спектр гэтых узаемаадносін: ад захаплення прагрэсам да супраціўлення яму. Такім чынам, разнастайнасць характараў, звязаных з чыгункай, дазваляе глыбей зразумець адлюстраванне эпохі ў мастацкай літаратуры і выявіць асноўныя тэмы, якія хвалявалі беларускіх пісьменнікаў у перыяд вялікіх сацыяльных і тэхналагічных змен.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Лынькоў, М.* Над Бугам : выбраннае / М. Лынькоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. — 446 с. — (Серыя: Беларуская проза ХХ стагоддзя).
2. *Чорны, К.* Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; рэдкал. : В. В. Барысенка, А. Адамовіч. — Мінск : Мастацкая літаратура., 1972—1975. — Т. 1 : Апавяданні 1923–1927 / рэд. тома А. Ф. Харкевіч, В. В. Барысенка, А. Д. Атаева. — 1972. — 542 с.
3. Аповесць 1920—1930-х гадоў : т. 20 / навук. рэд. Я. А. Гарадніцкі ; [уклад., прадм., камент. І. М. Шаладонава]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2020. — 782 с. — (Серыя: Залатая калекцыя беларускай літаратуры).
4. *Калюга, Л.* Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты / Л. Калюга. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. — 607 с. — (Серыя: Спадчына).
5. *Васілёнак, Я. П.* Выбраныя творы : у 2 т. / Я. П. Васілёнак. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. — Т. 1 : Апавяданні. — 359 с.



УДК 821.161.3



**А. М. Гурэцкая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*


## ГРАФІЧНЫЯ СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ ЭМОЦЫЙ У РАМАНЕ І. МЕЛЕЖА «ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ»

**Уводзіны.** У цэнтры ўвагі сучаснай лінгвістыкі знаходзіцца ў тым ліку і праблема функцыянавання сінтаксічных адзінак. Асаблівую значнасць набывае даследаванне экспрэсіўных сінтаксічных канструкцый — сінтаксічных сродкаў, якія ўдзельнічаюць у перадачы эмоцый, пачуццяў, ацэнак, надаюць паведамленню вобразнасць і выразнасць.

Асаблівасці індывідуальна-аўтарскага светаўспрыняцця перадаюцца праз графіка-пунктуацыйнае афармленне мастацкага твора, дзякуючы якому пісьменнік можа максімальна поўна «перадаць самыя тонкія сэнсавыя і эмацыянальныя адценні выказвання, а таксама праявіць сваю індывідуальнасць і аўтарскі стыль» [1, с. 93].

Рэпазіторый БарДУ